СЯРГЕЙ ДУБАВЕЦ

# Мы ляжым снапамі на таках…

Як казаў Камю, «мы занадта доўга жывём», каб гэтак настойліва не заўважаць зьменаў. Маю на ўвазе не новабудоўлі і, на жаль, ня зрухі насельніцтва ў кірунку ператварэньня ў нацыю, культуру, народ.

Маю на ўвазе такую дробязь, як эвалюцыя ўласнага разуменьня таго, што з намі адбываецца. Асабліва пасьля апошніх прэзыдэнцкіх «выбараў».

## «КРЫВАВЫ РЭЖЫМ»

Пазамінулай вясной, сабраўшыся недзе ў заходняй Нямеччыне, беларускія інтэлектуалы «штурмавалі» тэматычныя бастыёны нацыянальнай культуры. У дадзенай грамадзка-палітычнай сытуацыі. Дадзеную сытуацыю трэба было неяк называць. Нехта сказаў — «крывавы рэжым». Хе-хе. Інтэлектуалы звычайна пазьбягаюць патасу й клікушніцтва, ня любяць палітычнае ангажаванасьці, бо іх пошукі — у расслаеньні ўсяго нібыта адназначнага. Таму «крывавы рэжым» гучаў зь іхных вуснаў іранічна й саркастычна, у двукосьсях, з «гумарам». Але нічога лепшага й больш дакладнага для апісаньня сытуацыі інтэлектуалы не знайшлі. І вось, мінула крыху часу, і абляцела іронія, і «гумар» зноў стаў нясьмешны. Увесну рэжым такім ужо крывавым не выглядаў. Такім, як увесну 1996-га.

Цяпер ён і «рэжымам» не выглядае, толькі — «крывавым». Краінай правіць адзін пэрсанаж. Хто ён? Зараз я зраблю яму камплімэнт, назваўшы яго ў ягонай уласнай сыстэме каштоўнасьцяў — «Гітлер». Ён не зьмяніўся ад сваёй першай дэкларацыі пра гітлераўскую Нямеччыну, якая «адпавядае нашаму ўяўленьню аб прэзыдэнцкай рэспубліцы», не адышоў за гэтыя 16 гадоў ні на крок. Гэта яго праграма, яго крэда і ягоны бзік — усё разам узятае. Наколькі магчыма ў такой краіне і ў такую эпоху. Мошчная эканоміка, трасянка, аўстрыйскае

**Сяргей Дубавец** — публіцыст, пісьменьнік, крытык, выдавец. Аднавіў і рэдагаваў газэты «Свабода» (1990) і «Наша Ніва» (1991-2000).

паходжаньне (тожа рускія са знакам якасьці), шчасьлівыя пэнсіянэры, чыстыя вуліцы, спорт... Ворагі народа, жэстачайшым образам...

Паўтаруся, у нас не рэжым крывавы, а «Гітлер», апантаны квазі-фюрэр, які «чуе сьпінным мозгам». Вось жа пашанцавала старонцы мілай!.. Ён кіруе адзін. Не мільёны застрашаных прадстаўнікоў электарату, якія прадалі здаровы розум і сумленьне за пэнсію воўрамя, за кантракт, за амонаўскую сардэльку. Ніякі яны не рэжым. Яны проста вымушаныя так жыць, бо ня маюць выбару. Ён іх гэтага выбару пазбавіў начыста. І яны ў гэтым сэнсе ніяк ня менш пацярпелыя за «грамадзкіх актывістаў», бо яны звычайныя людзі, а не змагары, на іх урэшце і трымаецца сьвет на гэтым, як ён любіць казаць, куску зямлі. Прыбяры яго з пасады ці з рэальнасьці, і ні адзін сабака ня выйдзе на плошчу ў абарону «Гітлера». Бо «грешно молиться за царя Ирода».

## «ГРЕШНО МОЛИТЬСЯ»

Гэта з «Барыса Гадунова». Эвалюцыя «Гітлера» вядома якая. Усё павінна скончыцца крывішчай. Але ня так проста ўцягнуць у гэтае дзейства масы народу. У наш час, у нашым месцы сьвету. Шаснаццаць гадоў ён спрабуе наблізіць гэты момант і так і гэтак, але ўсё не паддаецца гэты народ. «Гітлер» хлусіць, а яны проста слухаюць. Ён саджае, а яны церпяць. Ну што ты станеш рабіць. Як іх уцягнуць? Здаецца, на мінулых «выбарах» працэс пайшоў.

Палітыка — гульня фігуркамі, тут нават страх і цынізм і галадоўкі з ЧМТ — усё нейкае шахматнае, умоўнае. А вось калі падключыць сюды мараль, сумленьне, усякае «единожды солгав», здраду, публічны данос, тады ўсё пераводзіцца ў рэальную плоскасьць і да крывішчы робіцца зусім блізка.

Першы крок — «рэгістрацыя ўсіх кандыдатаў». Зразумела, што ста тысяч не набрала й палова. Але важна, каб у сьпіс трапілі людзі выпадковыя і не гатовыя да гульні бяз правіл, якой цалкам распараджаецца «Гітлер». Такім чынам саўдзельнікамі ягонай хлусьні робяцца ўсе. І тыя, хто не набраў, і тыя, хто набраў, і тыя, хто за «Гітлера», і тыя, хто за альтэрнатыўных кандыдатаў. Адна вялікая хлусьня робіць увесь народ закладнікам «Гітлера».

Што мы там спрачаемся, за каго галасаваць, калі кандыдаты фальшывыя? І самае галоўнае — што б яны ні казалі — пра маральныя каштоўнасьці, пра эканоміку, пра плошчу — іхныя словы абсалютна нічога ня значаць, бо яны самі — прывіды, фікцыя, пустата. Яны не набралі належных ста тысяч. Большасьць зь іх. Але й тыя, што набралі, апынаюцца ў той самай кампаніі. І мы ўсе, увесь народ, трапляем у сытуацыю «единожды солгав».

Ну, калі я ці ты проста праігнаравалі гэтыя выбары ці ўкінулі супраць усіх, мы, можа быць, яшчэ ўратаваліся б. У кандыдатаў жа быў толькі адзін выхад — усім зьняцца. Калі б яны ўсе былі рэальныя, гэта значыць, набралі па сто тысяч, яны маглі б прынамсі пагаварыць пра гэта. Але яны былі фальшывыя. І ўсё, што яны казалі, і байкот, і плошча, на якую яны клікалі, усё ад пачатку было фальшывае.

## «ВЫБАРЫ»

Ну і за каго вы сабраліся галасаваць? І ці гатовыя назіральнікі? Яны пільнуюць, каб бюлетэні ня трапілі ў іншыя стосы. Яны патрабуюць чыстага падліку. Іх выдаляюць з участкаў. Складаюцца пратаколы. Згадзіцеся, усё гэта сапраўды вельмі падобна да выбарчага працэсу. Гэта актыўнасьць назіральнікаў ад дэмакратычных выбараў робіць тое, што адбываецца, падобным да выбараў. Пасьля цёця-старшыня выбарчага ўчастку ідзе ў кабінэт і перадае ў цэнтар тыя зьвесткі, якія ёй былі з цэнтру даведзеныя напярэдадні. Нашы бюлетэні да гэтых зьвестак ніякага дачыненьня ня маюць. Працэс падліку таксама. Зусім ня «важна, як палічылі». І нават тое, што цёця перадала другой цёці, — ня важна. Яна можа ўвогуле нічога не перадаваць. Проста другая цёця агучыць тое, чаго патрабуе «Гітлер».

Выбараў няма ня проста як выбараў. Іх увогуле няма. А тое, што вы бачыце на экране, — фальшыўка. А хіба вы не галасавалі за фальшывага альтэрнатыўнага кандыдата? Хіба вы яшчэ ня ў гэтай гульні?

А далей «Гітлер» вырубае адзінага альтэрнатыўнага, які кінуў яму харызматычны выклік і на якога астатнія «плашчаднікі» пазіраюць з прытоенай надзеяй. (А вось ужо й надзею вырубілі.) І сядае на ўсю ноч гуляць у сваю любімую гульню — правакацыі, дубінкі, амоны, турмы, аўтазакі. У галоўнакамандуючага гэта адзіная магчымасьць пакамандаваць баявымі дзеяньнямі — чарговы раз замачыць інтэлігенцыю, найперш маладую эліту гэтай недасьпелай нацыі.

А інтэлігенты, яны як целюкі, ідуць, куды іх гоніш. Цяжка справакаваць інтэлігенцыю на крывішчу.

Гэта самае ляканічнае апісаньне таго, што адбылося. Калі куча блатнякоў нападае на кучу інтэлігентаў, вынік заўжды магчымы толькі адзін.

## «ГІТЛЕР КАПУТ!»

Вам так карціць зноў крыкнуць «Гітлер капут!» Сваё «Жыве Беларусь!» вы крычыце ўжо шаснаццаць гадоў, укладаючы ў словы менавіта гэты зьмест — «Гітлер капут!». Але «Гітлер», як і ягоны кумір Гітлер, знойдзе свой капут толькі пасьля таго, як давядзе да вялікай крыві. Яму трэба аж захлынуцца крывёю. Такая яго прырода. Павольна, але няўхільна ён ідзе да сваёй мэты.

Мінулыя «выбары» ў гэтым сэнсе сталі яшчэ адным крокам. Пра «ворагаў народу» мы чулі даўно, а вось публічныя даносы прагучалі ўпершыню. Гэта значыць, мараль ужо прарвалася ў палітычную гульню. А калі так адбываецца, звычайна падае цана чалавечага жыцьця. Гэта перадумова, якая робіць магчымай крывішчу. Такім чынам «Гітлер» набліжаецца да апатэозу свайго праўленьня.

Апазыцыі ў выглядзе партыяў і кампаніяў больш няма, яна зьнікла ў цяню «Гітлера», у прасторы ягонай гульні, хлусьні і фальшу. Каб зноў набыць палітычную суб’ектнасьць, ёй трэба пераканфігуравацца на рэальных каштоўнасных падставах. Тады можна будзе сказаць, што, апроч «Гітлера», на гэтай зямлі ёсьць нехта яшчэ.